# Згода на апрацоўку персанальных даных

У адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2021 № 99-З «Аб абароне персанальных даных» да атрымання згоды на апрацоўку персанальных даных ААТ «ААБ Беларусбанк» прадастаўляе суб'екту персанальных даных наступную інфармацыю.

1. Аператар, які атрымлівае згоду суб'екта персанальных даных на апрацоўку персанальных даных:

ААТ «ААБ Беларусбанк», 220089, г. Мінск, пр-т Дзяржынскага, 18 (далей – Банк).

2. Мэта апрацоўкі персанальных даных:

ажыццяўленне рэгістрацыі папярэдняга запісу на абслугоўванне ў падраздзяленнях Банка і арганізацыя абслугоўвання ў адпаведнасці з Правіламі папярэдняга запісу на абслугоўванне ў падраздзяленнях ААТ «ААБ Беларусбанк».

3. Пералік персанальных даных, на апрацоўку якіх даецца згода суб'екта персанальных даных на карпаратыўным сайце Банка/ у тэрмінале-рэгістратары электроннай сістэмы кіравання чаргой:

прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца);

нумар мабільнага тэлефона (пры наяўнасці);

электронная паштовая скрыня ў сетцы Інтэрнэт (e-mail) (пры наўнасці).

4. Тэрмін, на які даецца Згода суб'екта персанальных даных на апрацоўку персанальных даных:

з дня дачы гэтай Згоды па дзень, на які зроблены папярэдні запіс (у выпадку адмены папярэдняга запісу – па дзень адмены папярэдняга запісу).

5. Суб'ект персанальных даных дае згоду на апрацоўку персанальных даных, якая ўключае наступныя дзеянні:

збор, сістэматызацыя, захоўванне, выкарыстанне, выдаленне, як з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі, так і без выкарыстання сродкаў аўтаматызацыі (з выкарыстаннем любых матэрыяльных носьбітаў).

У выпадку дачы суб'ектам персанальных даных згоды на апрацоўку сваіх персанальных даных прадастаўленыя даныя будуць апрацоўвацца Банкам у мэтах і на працягу тэрміну, пазначаных у пунктах 2 і 4 гэтай Згоды. Адмова ў прадастаўленні згоды цягне немагчымасць апрацоўкі персанальных даных у мэтах, названых у пункце 2 гэтай Згоды.

З прадстаўленай інфармацыяй, якая датычыцца апрацоўкі персанальных даных, азнаёмлены. Правы, механізм іх рэалізацыі, а таксама наступствы дачы згоды або адмовы ў дачы такой згоды растлумачаны, у тым ліку шляхам азнаямлення з Памяткай аб правах суб'екта персанальных даных, і зразумелыя. Акрамя спосабаў, названых у Памятцы, адкліканне гэтай Згоды магчыма таксама на сайце Банка ў раздзеле «Запіс на абслугоўванне»/у тэрмінале-рэгістратары электроннай сістэмы кіравання чаргой падраздзялення Банка, у якое зроблены папярэдні запіс.